ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гарному Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 35 (4287)
Чацьвер, 11 лютага 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 39

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: Л. МЭХЛІС—Другая пяцігодка і ліквідацыя клясаў (2 і 3 стар).

Пастанова XIV зьезду КП(б)Б па дакладу т. ГРЫСЕВІЧА аб рабоце прамысловасьці БССР у 1931 г. і задачах на 1932 г. (1 стар).

XVII партканфэрэнцыя—Дакл. т. КУЙБЫШАВА аб другой пяцігодцы Прамова т. ГАЛАДЗЕДА (2 і 3 стар.). Рэзалюцыя сходу Менскага партактыву па дакладу т. ГІКАЛО аб вынніках XVII Усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б. (3 стар.).

Ліст т. ЯКАЎЛЕВА Усесаюзнай камсамольскай нарадзе па вытворчай агратэхніцы (4 стар.).

КІТАЙ—Японскі праект падзелу кітайскіх тэрыторый (4 стар.).

ВЕРШЫ: АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ—Рамакс на конкурс (4 стар.).

АБ РАБОЦЕ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР У 1931 г. І ЗАДАЧАХ НА 1932 г.

Рэзалюцыя XIV зьезду КП(б)Б па дакладу тав. Грысевіча

I. Вынікі работы прамысловасьці ў 1931 годзе

Выкананьне пляну 3-га году пяцігодкі, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, адзначылася новымі сусьветна-гісторычнымі перамогамі рабочае клясы СССР і БССР, як неадлучнай часткі Ўсяго Савецкага Саюзу.

1931 год знамянуецца завяршаньнем пабудовы фундаменту сацыялістычнай эканомікі. Ленінскае пытаньне «хто кого» канчаткова вырашана на карысьць сацыялізму як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы.

Дзякуючы цьвёрдаму і няўхільнаму праведзеньню генэральнай лініі партыі, рабочая кляса, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, на падставе магутнага росту творчага энтузіязму, атрымлівае перамогу за перамогай у барацьбе за тэмпы — за выкананьне 5-пігодкі за чатыры гады.

Рад буйнейшых прадпрыемстваў і цэлых галін прамысловасьці выканалі сваё 5-гадовы плян за 2½ і 3 гады. 3-ці рамаючы год пяцігодкі па ўсім Савецкім Саюзе ўводзіць у строй рад гігантаў індустрыі; у БССР уведзены і ўводзяцца ў строй рад новых буйных прадпрыемстваў: Гомсельмаш, магілёўская фабрыка штучнага валакна, гомельская мэханізаваная гута, ацэтонавы і серка-вугляродны заводы, рад буйных торфараспрацовак, заводы па будматар'ялах, віцебская панчошная і швейная фабрыкі, завод «Дубцель», маргарынавы завод. Рад прадпрыемстваў, дзякуючы праведзенай рэканструкцыі, ператвораны з дробных у буйныя мэханізаваныя заводы і фабрыкі (завод імя Варашылава, «Камунар», «Бальшавік» і інш).

Гэтыя дасягненьні на фронце індустрыялізацыі ўзмацняюць тэхніка-эканамічную незалежнасьць і абароназдольнасьць Савецкага Саюзу.

З посьпехам праводзіцца перабудова сельскай гаспадаркі на сацыялістычных падставах. Пераможная барацьба за тэмпы індустрыялізацыі краіны, вялізарныя дасягненьні па разгортваньні галін прамысловасьці, якія выробляюць сродкі вытворчасьці, стварылі належную тэхнічную базу і забясьпечылі рашучы паварот бядняцка-серадняцкіх мас на шлях калектывізацыі. У 1931 г. у асноўных абожжавых раёнах Савецкага Саюзу завершана суцэльная калектывізацыя і на яе базе ліквідцыя кулацтва як кляса. Дасягнута ў 1931 г. звыш 62 проц. калектывізаваных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па Саюзе і 50,4 проц. па БССР у тры разы перавышаючы заданьне на апошні год пяцігодкі.

Праца прамысловасьці БССР у 1931 г. праходзіла пад знакам рашучага ажыцьцяўленьня пастановаў XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б аб тым, што «важнейшай задачай КП(б)Б у галіне ўдыму ўсёй народнай гаспадаркі ажыцьцяўляецца індустрыялізацыя БССР і ўсе большае павялічэньне ўдзельнай вагі прамысловасьці і ўзмацненьне яе вядучай і ператвараючай ролі ў развіцьці і сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі».

Рабочая кляса БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б і яе ЦК, на падставе няўхільнага правядзеньня генэральнай лініі партыі, рашучага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі дабілася значных посьпехаў у справе індустрыялізацыі БССР.

Няўхільна, з году ў год узмацняюцца тэмпы разгортваньня вытворчасьці прамысловасьці БССР. Валавая прадукцыя ўсёй прамысловасьці ў 1931 годзе дасягае 703,8 млн. руб., што складае прырост супроць 1929-30 г. на 72,3 проц. (без дробнай прамысловасьці).

У выніку пасьпяховага выкананьня пяцігадовага пляну значна павялічылася ўдзельная вага прадукцыі прамысловасьці ў прадукцыі ўсёй народнай гаспадаркі БССР: 23,6 проц. у 1928-29 г., 38,7 проц. у 1929-30 г. і каля 50 проц. у 1931 г.

Дасягнуты ў 1931 г. узровень выпуску прадукцыі па рэспубліканскай і саюзнай прамысловасьці ў адносінах запраектаванага ў апошні год пяцігодкі 1932-1933 г. складае 86,1 проц. Рад галін прамысловасьці: металёвая, дрэваапрацоўчая, гарбарная, паліграфічная, швейная ў 1931 г. дасягнулі, а некаторыя значна перавысілі, узровень прадукцыі апошняга году пяцігодкі, выканаўшы пяцігадовы плян за 2½ і 3 гады. Такім чынам, па ўсёй прамысловасьці ў цэлым задача выкананьня пяцігодкі за 4 гады поўнасьцю забясьпечана.

8 гады ажыцьцяўленьня 5-пігадовага пляну характарызуюцца карэннымі перагрупоўкамі асноўнага капіталу прамысловасьці БССР.

У 3-м рашаючым годзе 5-пігодкі капіталаўкладаньні ў дзяржаўную прамысловасьць склалі 75,4 млн. руб., узрастаючы супроць 1-га году пяцігодкі на 133,4 проц. За 3¼ гады капітальнае будаўніцтва (без энэргетычнай гаспадаркі) дасягнула 194,1 млн. руб. (76,7 проц. ад заданьня на ўсе 5 год пяцігодкі).

Вялізарнасьць ажыцьцяўленьня праграмы будаўніцтва і яе ўплыў на матар'яльна-тэхнічную базу прамысловасьці асабліва выразна вызначаецца ростам асноўнага капіталу па рэспубліканскай і саюзнай прамысловасьці ВСНГ з 35,4 млн. руб. у пачатку пяцігодкі да 147,6 млн. руб. на 1 студзеня 1932 г., г. зн. больш, чым у 4 разы.

Значна ўзрасла энэргетычная база народнай гаспадаркі БССР.

Высокія тэмпы разгортваньня прамысловасьці адбіваліся побач з ростам рабочае клясы БССР (на 134 проц. супроць пачатку пяцігодкі). Канчаткова ліквідавана беспрацоўе.

На падставе вялікіх посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва дасягнута значнае паляпшэньне матар'яльнага і культурнага становішча рабочае клясы (павышэньне зарплаты, перавод 75 проц. рабочых па рэспубліканскай прамысловасьці на 7-гадзінны працоўны дзень, павялічэньне на сямю ліку працуючых асоб, што дало павялічэньне бюджэту сям'і рабочага, рост бюджэту сацстрахаваньня, значнае разгортваньне жыльёвага і сацыяльна-бытавога будаўніцтва).

Значнае разгортваньне сеткі навучальных устаноў як для падрыхтоўкі каманднага складу па прамысловасьці (6 ВТНУ, 20 тэхнікумаў), так і для падрыхтоўкі масавай кваліфікаванай рабочай сілы (ФЗБ, ШУМП'ы, курсы), а таксама наяўнасьць у складзе тых, што навучаюцца, звыш 70 проц. рабочых і 13 проц. калгасьнікаў, сераднякоў і беднякоў, забясьпечваюць ужо ў бліжэйшым будучым папаўненьне прамысловасьці БССР кваліфікаванымі рабочымі кадрамі і інж.-тэхн. камандным складам са сваёй рабочай вытворча - тэхнічнай інтэлігенцыі.

Усе гэтыя вялізарныя посьпехі, якіх дасягнула партыя ў разгортваньні прамысловасьці, сведчаць значна большую моцную тэхнічную базу для далейшай, больш шыракай індустрыялізацыі БССР і сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

КП(б)Б на чале з яе ЦК, пад кіраўніцтвам ПК УсеКП(б), дабілася такіх вялізарных перамог, разгортваючы сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, у рашучай барацьбе з клясавым ворагам і яго агентурай, з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з «левымі» загібамі, у барацьбе з рэшткамі контрэвалюцыйнага трацкізму, са сказіваньнямі марксізма-ленінскай тэорыі, гнілым лібералізмам і прымірэнцтвам да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі.

II. Недахопы прамысловасьці ў 1931 г.

Пры вялізарных посьпехах прамысловага будаўніцтва ў 1931 г. зьезд з усёй рашучасьцю адзначае і значныя недахопы ў яе рабоце:

а) Плян па валавой прадукцыі па прамысловасьці выкананы на 79 проц., у тым ліку па рэспубліканскім ВСНГ — 64,1 проц., па саюзным ВСНГ — 67,5 проц., па НКСнабе — 75,8 проц. і мясцовай прамысловасьці—84,2 проц.

Асабліва прарыў у недавыкананьні пляну паказвае тарфяная прамысловасьць (51,6 проц. выкананьня пляну при росьце на 70 проц., супроць 1930 г.), што ўсугубіла прарыў на цэлым радзе прадпрыемстваў у выкананьні прамфінпляну. Таксама дрэннае выкананьне пляну паказваюць хімічная прамысловасьць і прамысловасьць будматар'ялаў.

б) Недавыкананы плян прамысловасьці і на якасных паказальніках па прамысловасьці ВСНГ пры росьце зарплаты на 12,6 проц., замест плянавых 5,6 проц., прадукцыйнасьць працы дасягнула толькі 15,8 проц., замест 33,4 проц. паводле пляну. Прамысловасьць НКСнабу, пры перавыкананьні пляну па зарплаце на 8,5 проц., недавыкаравала пляну па прадукцыйнасьці працы на 18,9 проц. У выніку невыкананьня пляну рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, непрыняцьця ліку рабсілы ў адпаведнасьць з прамфінпляном, зьніжэньне сабекошту дало толькі 1,2 проц. замест 5,1 проц. паводле пляну.

в) Ніпчэ дагэтуль становішча з якасьцю прадукцыі застаецца незадавальняючым, а па некаторых галінах прамысловасьці (шаяровая, абутковая, запалкавая, швейная) у 1931 г. ёсьць пагоршаньне якасьці прадукцыі.

Зьезд канстатуе, што асноўнай прычынай невыкананьня пляну па колькасных і асабліва па якасных паказальніках зьяўляецца вусім незадавальняючае ажыцьцяўленьне 6-ці гістарычных умоў тав. Сталіна. Наяўнасьць яшчэ ў значнай меры абазьлічкі, дробна-буржуазнай урачнілаўкі ў зарплаце, недастатковая дысцыпліна, яшчэ высокі процант прагулаў і недастатковае замацаваньне адзіначальля, слабае ўкараненьне і правядзеньне гаспадарчага разрахунку, яшчэ незадавальняючае матар'яльна-культурнае абслугоўваньне рабочых, незадавальняючыя тэмпы перабудовы партыйна-масавай работы, цякучасьць рабочай сілы і няўменьне гаспадарчых арганізацый пераключыцца на новыя формы і мэтады вярбоўкі рабочай сілы, слабыя тэмпы перабудовы работы гаспадарчых арганізацый і пераключэньне іх на работу і кіраўніцтва па-новаму, слабае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб падрыхтоўцы новых кіруючых і тэхнічных кадраў.

Зьезд рашуча падкрэсьлівае, што на ліквідацыі гэтых недахопаў у 1932 г. павінна быць сканцэнтравана ўвага ўсіх партыйных, прафэсыянальных арганізацый, усёй рабочай клясы і што зьніжэньне гэтых недахопаў зьяўляецца асноўнай заручкай далейшых, яшчэ больш буйных посьпехаў сацыялістычнай прамысловасьці.

III. Плян 1932 г. і асноўныя яго задачы

Выходзячы з дасягнутых посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве ў 3-м рашаючым годзе пяцігодкі, неабходнасьці далейшага ўзмацненьня вядучай ролі сацыялістычнай індустрыі, перавод усёй народнай гаспадаркі на вышэйшую тэхнічную ступень, замацаваньня і пашырэньня сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, выходзячы з задач пасьпяховага ажыцьцяўленьня пяцігодкі за 4 гады і ўзмацненьня тэхніка-эканамічнай незалежнасьці СССР ад капіталістычнага сьвету, зьезд намячае наступныя задачы: ухваліць зацьвярджэньні ПК і СНК плян на 1932 г.

Па валавой прадукцыі на 1932 г. рост (у цэнах 1926-27 г.) на 52,1 проц. супроць 1931 г., што перавышае заданьне на апошні год пяцігодкі на 22,3 проц. (па рэспубліканскай і саюзнай прамысловасьці), прырост валавой прадукцыі па галінах прамысловасьці, якія вырабляюць сродкі вытворчасьці у 71,7 проц.

Зьезд падкрэсьлівае, што вызначаны капіталаўкладаньні 1932 г. у 87,5 млн. руб. у першую чаргу павінны забясьпечыць сканчэньне аб'ектаў, якія пачаты ў мінулыя гады, а таксама і патрэбнае іх дабасталяваньне, і, у прыватнасьці, у першую чаргу цэмэнтнага заводу, шклянога заводу, трубалітэйнага заводу, Гомсельмашу, ацэтонавага заводу, а таксама разгорнутае будаўніцтва па ўзмацненьні апалівай базы БССР і вырабу будматар'ялаў.

Вызначаныя для прамысловасьці на 1932 г. заданьні па давядзеньні сярэднясьпісочнай колькасьці рабочых да 89.200 чал., росту прадукцыйнасьці працы на 22 проц. і зарплаты на 7 проц., павінны забясьпечыць зьніжэньне сабекошту на 6 проц.

Выкананьне задач 4-га, завяршальнага году пяцігодкі высоўвае задачу ліквідацыі гэтых недахопаў у 1932 г. павінна быць сканцэнтравана ўвага ўсіх партыйных, прафэсыянальных арганізацый, усёй рабочай клясы і што зьніжэньне гэтых недахопаў зьяўляецца асноўнай заручкай далейшых, яшчэ больш буйных посьпехаў сацыялістычнай прамысловасьці.

IV. Арганізацыя вытворчасьці

Намечаныя плянавыя заданьні для прамысловасьці патрабуюць з боку партыі, рабочае клясы, усіх гаспадарчых і прафэсыянальных арганізацый і ІТР правільнай арганізацыі вытворчасьці і працы на прадпрыемстве, максымальнага скарыстаньня абсталяваньня і энэргіі.

Зьезд рашуча падкрэсьлівае, што пасьпяховае выкананьне пляну 1932 году магчыма толькі пры рашучым ажыцьцяўленьні пясьці гістарычных умоў тав. Сталіна і лічыць неабходнымі:

1) У бліжэйшы час поўнасьцю зьніжыць момэнты абазьлічкі ў працы прамысловасьці, наблізіць тэхнічнае кіраўніцтва да цэху і варштату і правесьці цярпілівую растлумачэньне рабочай сілы, зьніжэньне абазьлічкі на заводах, у цэху, брыгадзе, агрэгаце і тым самым забясьпечыць правільную арганізацыю працы.

2) Канчаткова зьніжыць існуючы яшчэ самацёк у справе забясьпячэньня прамысловасьці рабочай сілай, асабліва сезоннай.

Перайсьці ад «палітыкі» самацёку па палітыцы арганізаванага набору рабочых на прадпрыемствах для прамысловасьці шляхам заключэньня ўмоў з калгасамі, з бядняцка-серадняцкім сяльгаспам, з ЖАКТ'амі, значна палепшыць для пасьпяховасьці выкананьня гэтай задачы склад вярбовачнага апарату. Разам з гэтым зьвярнуць асаблівую ўвагу на недапушчальнасьць ліпкаў рабочай сілы на прадпрыемствах, даводзячы лік рабочых на прадпрыемствах ў поўнай адпаведнасьці з прамфінпляном 1932 году.

3) У мэтах замацаваньня рабочай сілы за прадпрыемствамі і зьніжэньня іх цякучасьці, зьезд прапануе канчаткова зьніжыць «лявацкую» ўрачнілаўку ў зарплаце, максымальна ахапіць рабочых індывідуальна-вызьвальнай аплатай працы і рашуча палепшыць пастаноўку работы органаў тэхнармаваньня на прадпрыемствах; прагрэсыўную зьдзельшчыну ўводзіць на рашаючых участках там, дзе гэта магчыма, заглядзе дасканала падрыхтоўваючы яе ўвядзеньне, не дапушчаючы павялічэньня сабекошту; пры ўвядзеньні прагрэсыўнай аплаты, нормы выпрацоўкі павінны быць тэхнічна ўгрунтаваны.

Вылучыць на аплату вядучых прафэсій і рабочых, занятых на больш кваліфікаваных работах, мабілізуючы шырокія рабочыя масы на зьніжэньне цякучасьці, ліквідацыю прарывоў, уздым прадукцыйнасьці працы і ўзмацненьне працоўнай дысцыпліны.

4) Рацыяналізацыя вытворчасьці, максымальная эканомія матар'ялаў і палівы, зьніжэньне страт, стварэньне спрыяючых умоў для разгортваньня рабочага вынаходзтва і ўкараненьне, скарачэньне вытворчых выдаткаў павінна стаць у цэнтры работы прадпрыемстваў і аб'яднаньняў прамысловасьці. Веданьне фінансавай гаспадаркі прадпрыемства, вывучэньне становішча сабекошту павінна ператварыцца ў адзін з асноўных элемэнтаў канкрэтнага кіраўніцтва прамысловасьцю.

5) Зьезд прапануе гаспадарчым, прафэсыянальным і партыйным арганізацыям разгарнуць бальшавіцкую барацьбу за ўкараненьне гаспадарчага разрахунку і сапраўднага кантролю рублём, праводзячы рашучую барацьбу з апартуністычнай недаацэнкай гаспадарчага разрахунку і фармальным яго правядзеньнем. Цьвёрда кіруючыся ўстаноўкай тав. Сталіна — «укараніць і ўмацаваць гаспадарчы-разрахунак, узьняць унутрыпрамысловае накапленьне», — партыйным, гаспадарчым і саюзным арганізацыям забясьпечыць сапраўдны кантроль над зьніжэньнем сабекошту, павышэньнем якасьці прадукцыі і выкананьнем дагавораў, далейшым пашырэньнем гаспадарча-разрахункавых брыгад, замацаваньнем пераводу на гаспадарчы разрахунак цэхаў, забясьпечаючы на гэтай падставе далейшае ўнутрыпрамысловае накапленьне.

6) Пасьпяховае выкананьне пляну капітальных работ у чацьвертым, завяршальным годзе пяцігодкі патрабуе рашучага ўзмацненьня жывога канкрэтнага як гаспадарчага, так і тэхнічнага кіраўніцтва, а таксама сапраўднага плянаваньня з боку ВСНГ усіх аб'ектамі будаўніцтва.

7) Ухваляючы пастановы ЦК адносна інжынэрна-тэхнічных работнікаў, зьезд даручае замацаваць дасягнутыя вынікі ў гэтым напрамку шляхам далейшага стварэньня ўмоў, спрыяючых разгортваньню творчай ініцыятывы ІТР, стварэньня ўмоў вытворчай рызыкі, вылучэньня лепшых, праявіўшых сябе, адданых сацыялістычнаму будаўніцтву спэцыялістаў на адказныя пасты ў прамысловасьці, а таксама іх далейшага палепшэньня бытавога і культурнага абслугоўваньня.

8) Зьезд ухваляе пастанову ЦК УсеКП(б) аб арганізацыі новых наркоматаў прамысловасьці, якая зьяўляецца буйнейшым палітычным крокам партыі ў барацьбе за канкрэтнае кіраўніцтва пасобнымі галінамі народнай гаспадаркі, за ажыцьцяўленьне лёзунгу «Па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць».

Зьезд даручае ЦК, у ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б), распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па арганізацыі кіраўніцтва прамысловасьцю БССР.

9) Пасьпяховае выкананьне пляну 4-га, завяршальнага году пяцігодкі патрабуе далейшай перабудовы ўсёй партыйна-масавай і прафэсыянальнай работы ў напрамку максымальнай арганізацыйнасьці і канкрэтнасьці кіраўніцтва, рашучага ўзмацненьня нізавых, партыйных, прафсаюзных зьвеньняў на вытворчасьці, правільнай расстаноўкі камуністычных сіл, далейшага павышэньня ролі камуністаў, шырокага разгортваньня і рашучага палепшэньня зьместу масавай працы ў цэху, зьмене, групе, брыгадзе, агрэгаце, асабліва ўмацняючы вытворчую працу сярод новых пластоў рабочых, жанчын, моладзі і сезоннікаў.

10) Палепшэньне капітальнага будаўніцтва і задача максымальнага ўводу ў 1932 годзе новых прадпрыемстваў высоўвае задачу рашучага палепшэньня працы будаўніцтва і прамысловасьці будматар'ялаў у напрамку максымальнай канцэнтрацыі матар'яльных і фінансавых сродкаў і людзкіх сіл, перагрупоўку на будаўніцтва на працягу ўсяго году, больш глыбокай папярэдняй падрыхтоўкі прадпрыемстваў да будаўніцтва (падрыхтоўка пляцоўкі, складаньне кошторысных плянаў будаўніцтва, укараненьне механізмаў), усямернага разьвіцьця вырабу будматар'ялаў на мясцовых сырцы і асабліва новых іх відаў.

З боку гаспадарчых арганізацый, замацаваньня і задача максымальнага ўводу ў 1932 годзе новых прадпрыемстваў высоўвае задачу рашучага палепшэньня працы будаўніцтва і задача максымальнага ўводу ў

XVII канфэрэнцыя ВсесКП(б)

ДАКЛАД тав. В. В. КУЙБЫШАВА АБ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДДЦЫ*)

Сярэдня-Волскі край.

Тут разьвіваецца буйная прамысловасьць, асабліва азотная, выраб фасфарытных угнаеньняў. Валізарны рост апошнім часам выраб якасных сталяй для машынабудаўніцтва, што павінна быць асабліва рашуча падтрымана. Магутна разьвіваецца і машынабудаўніцтва—горнаазодзкае абсталяваньне, якое будзе выраблена на старым і новым Краматорскіх заводах, паравозабудаўніцтва, якое будзе ажыцьцяўляцца на старым і новым Луганскіх заводах і ХПЗ, вагонабудаўніцтва на заводзе імя «Прагрэсу», суднабудаўніцтва на Мікалаеўскім заводзе, на Астраскім і Сызаропольскім заводах і на новым Маскрыцыльскім, трактарабудаўніцтва, электрамашынабудаўніцтва.

Хімічная прамысловасьць будзе выраблена галоўным чынам на кіеўскім заводзе «Вальпавік», павінна быць разгорнут выраб абсталяваньня для цукровых заводаў. У частцы лёгкай прамысловасьці разьвіваецца цукар, шоўка, мясная, бакалейная прамысловасьць у новых багаценных раёнах.

З поўнай магутнасьцю будзе працаваць Дняпроўская гідрастанцыя і Дняпроўскі комбінат, што будзе вялікім укладам у гаспадарку Савецкага Саюзу і вялікі зьмогчы эканоміку усёй Украіны. Разьвіваецца чыгунак пойдзе да лініі электрыфікацыі, пракладкі другіх шляхоў, абсталяваньня сартавачных станцый і новага чыгуначнага будаўніцтва.

Сельская гаспадарка Украіны павінна разьвівацца па тых напрамках, якія былі да гэтага часу, г. зн. побач са абожкавай, пшаэічнай гаспадаркай Украіна павінна пазялічыць вырошчваньне тэхнічных культур і у галіне цукровых буракоў, і у галіне канапель, і у галіне бавоўны.

Паўночна-Каўказкі край у другім пяцігодзьдзі захоўвае свае характэрныя рысы раёну, які алучае буйную таварную сельскую гаспадарку, галоўным чынам, у галіне пшаніцы, з разьвіцьцём ашчаўкоўваючай прамысловасьцю. Асноўнымі галінамі прамысловасьці ў галіне—нафта і вугаль. Маркуецца, што на усіх нафтавых раёнах Паўночна-Каўказкага краю да канца пяцігодзьдзі павінна быць здабыта 22-30 млн. тон нафты, у тым ліку па Грознафце—17-18 млн. (уключаючы сюды дагестанскую нафту і Бакінскі раён) і па майкопскай нафце—11-12 мільёнаў. Удзельная вага паўночна-каўказкага вугалю ў здабычы па Данбасе павінна ў пяцігодзьдзі павялічыцца і паводле папярэдніх падлікаў здабыча вугалю ў 1937 г. павінна складзіць прыблізна 15 млн. тон.

Разьвіваецца каляровая металюргія—палімэталі, цынк, сьвінец, стаўшца выраб алюмінія на Сулакскай гідрастанцыі. Па машынабудаўніцтве, апрача вялікіх ужо заводаў, пабудаваных зараз, Росельмашу і Ростсельмашбаўду—магчыма пабудова аўтазбораўчага заводу, магчыма пабудова заводу транспартных машын і рэканструкцыя цэлага раду старых заводаў. У галіне хімі прадстаўць будаўніцтва суперфасфатных заводаў, заводаў па скарыстаньні натуральных газаў (Дубэнт) і мясцовага вугалю для выробу азоту.

У галіне сельскай гаспадаркі побач з раней пяцігадзьдзі, Паўночна-Каўказкі край стаўновіцца адным з асноўных раёнаў па разьвіцьці тэхнічных культур, прычым мацнейшае становішча зойме на італьянскіх кампопілях і кенафе. Апрача таго, валізарнае разьвіцьцё павінна атрымаць пеналіўная бавоўна, цукровыя буракі, соя, клеччавіна, садаводства і г. д. Апрача гэтым расьце пераапрацоўчая прамысловасьць, будуцца рад канцэрвовых і цукровых заводаў, кенафяная фэка і т. д.

Энергетычную базу Паўночна-Каўказкі край атрымае ў выглядзе дзвюх вялікіх электрастанцый: адна Сулакская гідрастанцыя і другая Белая Калітва на штыбу. Станцыі гэтыя намечаны пабудаваць, канчаткова выраблены будзе тады, калі мы будзем канчаткова складаць другую пяцігодку. Будзе разгорнута вялікае транспартнае будаўніцтва і ў галіне чыгуначнага транспарту і ў галіне водзнага транспарту, заканчваюцца работы па морскім канале і будаўніцтве порту ў Растове і пашыраецца судналоўнасьць Дону.

Цяпер я пераходжу да наступнай вобласьці—**Цэнтральна-Чорназемнай вобласьці.**

Тут моцна расьце энергетычная база. Апрычыны магутнасьць электрастанцый, на прыбліжных падліках павінна дайсьці да 350 тыс. кілёват. Атрымваецца далейшае разьвіцьцё—чорная металюргія ў результаце ўводу ў эксплёатацыю новых доменных печаў на Ліпецкім заводзе. У другім-жа пяцігодзьдзі павінна быць праведзена шырокая падрыхтоўка да індустрыяльнага асваеньня магутных жалезарудных покладаў Курскай магнітнай аномаліі.

На лініі машынабудаўніцтва, побач з рэканструкцыяй існуючых машынабудаўнічых заводаў, магчыма будзе пабудована вагонабудаўнічы завод у Варонежы. Значнае разьвіцьцё павінна атрымаць прамысловасьць, пераапрацоўваючая с.-г. сырэц. Павінны быць пабудаваны новыя цукровыя заводы, маслабойныя, эфіра-маслабойныя, кіравачнашпагатныя, рад новых броварэў, разьвіта пянька-ткацкая вытворчасьць. З поўнай магутнасьцю будзе працаваць завод сынтэтычнага каўчука і апрача таго, магчыма, будзе пабудован новы завод. Значнае разьвіцьцё павінна атрымаць сьвінагадоўля, яйцаптушэйцкая справа і галіны прамысловасьці, што базуюцца на гэтай аснове. У галіне новага чыгуначнага будаўніцтва намячаецца будаўніцтва некаторых ліній. Асноўныя работы ў галіне чыгуначнага транспарту прыходзяцца на электрыфікацыю Курскага напрамку, які жывіць індустрыяльны цэнтры даненкім вугалем.

Маскоўская вобласьць. Працэс пераўтварэньня Маскоўскай вобласьці в тыпова-тэкстыльнага раёну ў раён машынабудаўніцтва, электратэхнікі і хэміі, які шырока разгарнуўся ўжо ў першым пяцігодзьдзі, павінен быць пагыблены і замацаваны ў другім пяцігодзьдзі. Значна ўмацуецца і пашырыцца сетка электрастанцый як шляхам пашырэньня існуючых, так і шляхам уводу ў эксплёатацыю электрастанцыі ў Бобрыках магутнасьцю ў 300 тыс. квт., Фрунзенскай у 150 тыс. квт., якія працуюць на падмаскоўным вугалі, і Цьверскай, магутнасьцю у 150 тыс. квт., якая працуе на аршанскім торфе. Да 1937 г. у Маскоўскай вобласьці будуць працаваць, апрача Нова-Тульскага і Касагорскага заводаў, дзьве доменныя печы на прыпты зваяках. Лініі разьвіцьця электратэхнічнай прамысловасьці і машынабудаўніцтва акрэсьліваюцца неабходнасьцю спецыялізацыі Маскоўскай вобласьці на адказных відах вытворчасьці, што павінна прывесьці да столькі да будаўніцтва новых прадпрыемстваў, колькі да спецыялізацыі і канцэраваньня існуючых а мэтай асваеньня перадавой тэхнікі.

У другім пяцігодзьдзі намячаецца магутнае разьвіцьцё хімічнай прамысловасьці У прыватнасьці ўводзіць у эксплётацыю заводы працыпітата падпойнага суперфасфату, нітрафасфату, а таксама рад заводаў па выробе амійку металам канцэрсп. Асноўныя лініі спецыялізацыі сельскай гаспадаркі зрахоўваюцца ў самай цеснай залежнасьці ад яркага выяўленага індустрыяльнага характару раёну і глебава-кліматычных умоў яго.

Яны ў асноўным зводзяцца да ільнаводзтва, бульбаводзтва і гародніцтва, а таксама да інтэнсыўнай жывёлагадоўлі малочна-мясога напрамку. Вялізарная роля Масквы, як разьмеркавальна-транзітнага цэнтру, патрабуе арганізацыі магутнага разьмеркавальнага транзітнага кольца чыгунак, на аснове электрыфікацыі гэтага кольца Маскоўскага вузла і прыгарадных зносін. Рашучыя зрухі павінны быць дасягнуты ў справе скарыстаньня водных шляхоў зносін, у асаблівасьці, вярхоўю Волгі і ее прытокаў. Вырашэньне транспартных праблемы ў гэтай ее частцы будзе супроваджацца вырашэньнем праблемы водазабесьпячэньня Масквы. Масква ў сувязі з вялізарным камунальным і жыльлёвым будаўніцтвам стане буйнейшым і найбольш «благоустроенным» пралетарскім цэнтрам СССР.

Іванава-прамысловая вобласьць. Гістарычна-складзеная выключная спецыялізацыя ПВ на лініі базоўна-пашыраваі прамысловасьці ня можа захавацца цалкам на пытаньні пяцігодзьдзя, бо, як правіла, новыя базоўна-пашыровыя прадпрыемствы ў гэтай вобласьці будуцца ня будуць, існуючыя-ж базоўна-пашыровыя прадпрыемствы павінны ў другім пяцігодзьдзі быць рашуча рэканструяваны а мэтай іх спецыялізацыі на высока-якасных тканінах для ўласнага спажываньня, экспартных тканінах і тэхнічных у прыватнасьці. У вобласьці павінны таксама атрымаць разьвіцьцё прадпрыемствы, якія выробляюць рэчы з тэхнічных тканін, так, у прыватнасьці намечана да пабудовы завод пажарных рукавоў. Значнае разьвіцьцё атрымае адстаючая галузь пераапрацоўкі ільну ў форме будаўніцтва сеткі прадпрыемстваў па першапачатковай апрацоўцы ільну і раду ільнакамбінатаў. Адстаючая заходнетыўная база вобласьці значна ўмацуецца ў результаце ўводу ў эксплёатацыю Яраслаўскай гідрастанцыі і пабудовай раду цепляных станцый. У другім пяцігодзьдзі павінны быць ужываны і створаны новыя галіны прамысловасьці, разьвіцьцё якіх зьменіць характар Іванава-прамысловай вобласьці. У Іванава-прамысловай вобласьці ёсьць выстарчальныя прадпасылкі для разьвіцьця тэкстыльнага машынабудаўніцтва, суднабудаўніцтва, аўтабудаўніцтва і хэміі.

Магутнае разьвіцьцё у вобласьці павінна атрымаць хімічная прамысловасьць шляхам далейшага разгортваньня гумавага камбінату і сумежных з ім галін, пашырэньня лякафарбовачнай прамысловасьці, прамысловасьці шчучыкага каляніта, а таксама стварэньня ўласнай чуткавай прамысловасьці на базе скарыстаньня мясцовага жалезнага фасфарытаў раёнаў Кастромы, Юрэвцы і р. Чыжі. Лясная багацьцем вобласьці ставяць за ўвесь рост праблему разьвіцьця папяровай прамысловасьці, а таксама галін, якія пазіцуюць на адходах лесапераапрацоўкі, лесахэміі ў асаблівасьці. На менш значным пяроды гады пяцігодкі. Такі вынік ажыцьцяўленьня высунутага тав. Сталінам на XIV зьезьдзе партыі (1925 г.) лёзунгу: «ператварыць нашу краіну з аграрнай у індустрыяльную, здольную вырабляць сваімі ўласнымі сіламі патрэбнае абсталяваньне». У правядзеньні гэтай праграмы тав. Сталін бачыў **аснову нашай генэральнай лініі.**

Імкнна гэтыя посьпехі дазволілі партыі паставіць задачу—стварыць у другой пяцігодзьдзі **навейшую тэхнічную** базу для **усіх галін народнай гаспадаркі.** Вялізарнейшая праграма **савецкага машынабудаўніцтва,** якому належыць вядучая роля у завяршэньні рэканструкцыі народнай гаспадаркі, праграма электрыфікацыі—выраб электраэнергіі ўзрасьце ў 6 разоў, намячэньні па раз горлаваньні чорнай і каляровай металюргіі, па здабычы вугалю і нафты, па чыгуначным і водным транспарце і г. д. забясьпечваюць пераўтварэньне Савецкага Саюзу з краіны, якая ўрозьць машыны і абсталяваньне, у краіну, якая выробляе іх. Гэта канчаткова «забясьпечыць за СССР эканамічную самастойнасьць, якая ахоўвае СССР ад перападзеньня яго ў прыдатак капіталістычнай сусьветнай гаспадаркі» (XIV зьезд УсесКП(б).

Гэты-ж тэзіс — аб необходнасьці змяніць грамадзкую фэрму вытворчасьці ў сельскай гаспадарцы—тав. Сталін выставіў яшчэ раней—на XV пасяджэньні пленуму ЦК у 1928 г., ацэнтраваўшы стратэгічны плян **саўгаснага і калгаснага будаўніцтва.**

Правда-апартуністычныя элементы ў партыі, на чале якіх стаяла група тав. Бухарына, заказалі ўпартае супраціўленьне партыі ў разгорнутым наступленьні сацыялізму на ўсім фронце. Памяншэньню разумеючы законы пашыранай рэпрадукцыі ў нашай гаспадарцы, яны высоўвалі тэорыю аб «мірным урастаньні кулака ў сацыялізм». У перакладзе на практычную мову гэта азначала спаборніцтва ранейшай гаспадаркі, у канчатковым выніку, растаўрацыю капіталізму.

Партыя не пайшла на гэтым капітуляцкім шляху, скалькіраваўшы гуманальны агонь на правым уклене, як галоўнай небясьпецы ў рэканструкцыйны перыяд. У выніку—у калгасах абліканы зьвыш 60 проц. сялянскіх гаспадарак, калгасная вытворчасьць зайняе каля 80 проц. сялянскіх пасеўных плошчаў, Савецкі Саюз ператварыўся з краіны дробна-таварнай сялянскай гаспадаркі ў краіну самага буйнага земляробства.

Сацыялістычны сэктар абсалютна пераважае і ў сельскай гаспадарцы. Кіраўні капіталізму—яго фундамэнт—канчаткова падарваны ў нашай краіне, а адсюль вынікае, што канчаткова падарвана дыферэнцыацыя сялянства. Рэзкая супярэчнасьць паміж грамадзкай формай вытворчасьці ў прамысловасьці і ў сельскай гаспадарцы з посьпехам выратаваная на карысьць сацыялізму. Завяршэньнем у 1932-33 г. у асноўным сацыяльнай калектывізацыі яны поўнасьцю адпадаюць. Вытворчасьць у прамысловасьці і ў земляробстве зробіцца на ўсёй нарэшце гаспадарцы на самай сацыяльнай прыводзе адмаўтыпавай, хаця поўнай якасьці ня будзе. Вырашэньне гэтай пістарычнай важнасьці задачы—пераробка дробнатаварнай сялянскай гаспадаркі на сацыялістычны лад і ліквідацыя кулацтва—будзе спрыяць значна большаму буйнаму росту прадукцыйных сіл у нашай краіне.

У цэлым у краіне пашыраная рэпрадукцыя ідзе па формуле разгорнутага наступленьня сацыялізму на усім фронце. Кулацтва ліквідуецца як клас на базе сацыяльнай калектывізацыі. Капіталістычныя элементы зьнікаюць да дна. Сацыялістычная гаспадарка апаноўвае на крутым уздыме. Народны даход нацыянальна ўзрастае тэмпамі, якіх на ведае гісторыя чалавецтва. У 1929 г. (у зіставлен. цэнах 1926-27 г.) ён складаў 28,8 млрд. руб.; у 1930 г.—33,3 млрд.; у 1931 г.—38,1 млрд. руб.; у 1932 г. прадпісуецца—42,4 млрд. руб. У прапанатах да пашырэньня гэтага—ліквідыя ўзрастаючая крыўка пацёму.

Пашыраная сацыялістычная рэпрадукцыя адзначаецца выяўленьне ў росьце ўзрамацаньня сэктару народнай гаспадаркі. Роль прыватнага сэктару ва ўмовах гады ідзе і абсалютна і адносна: у 1928 г. яго ўдзельная вага тварылася 47,3 проц; у 1929 г.—39,9 проц.; у 1930 г.—27,6 проц; у 1931 г.—18,5 проц., а ў 1932 г.—0,3 проц. З завяршэньнем у 1932-33 г. у асноўным сацыяльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацкага рода прыватнага сэктару у нашай эканоміцы будзе ізаляваны.

Сацыяльна-эканамічныя арухі заходзяць адлюстраваньне ў разьмеркаваньні даходаў. Доля рабочых у даходзе нацыянальна ўзрастае: 1929 г.—32 проц; 1932 г.—47 проц. Аналагічны мае ліпак даходаў калгасьнікаў: 1929 г.—1 проц., 1932 г.—30 проц. Што датычыць капіталістычных элементаў горада ды кулацтва на вёсцы, дык іх даходы: 1928 г.—4,5 проц., 1932 г.—0,1 проц.

Гэта азначае, што гігантскі шпарэлі крокамі ліквідуецца ў нашай краіне «мачыманьне для ніжняга грамадзкага пласта сябруць з сабе і ўскладзьці на плечы грамадзкіх пластаў натуральную неабходнасьць працы». (Марксо). Цяпер

---

*) Канец дакладу т. Куйбышава. Пачатак глядзі ў № 34).

Заходняя вобласьць

Заходняя вобласьць уладае моцнай энергетычнай базай у выглядзе торфу, прычым разьвітая чыгуначная сетка дае асаблівы спрыяючы магчымасьці для разьвіцьця ўсіх галін гаспадаркі ў вобласьці. Таму ў другім пяцігодзьдзі Заходняя вобласьць робіць вельмі вялікі крок у сэнсе індустрыяльнага разьвіцьці. Цэнтральным мерапрыемствам для рэканструкцыі гаспадаркі Заходняй вобласьці зьяўляецца стварэньне электрастанцыі на Жарсаўска-Сьвіцкім торфяным масьве, як асноўе торфа-хімічнага камбінату і базы электрыфікацыі паўночнай часткі вобласьці. Заходняя вобласьць усё цэлае зьяўляецца найбольш буйным ільна-канапляводчым раёнам. Ператварэньне ле ў порадовы ільнаводны раён, намечанае Саўнаркомам ДССР у 1930 г., заварэньне ў другім пяцігодзьдзі рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і будаўніцтвам льнапераапрацоўчых прадпрыемстваў на тонкі нерпанечатковай апрацоўкі ільняных, але льнапрадзільных і ткацкіх фабрык і г. д. Разьвіваецца жывёлагадоўля, асабліва сьвінагадоўля. Пляч. пасьць месцапарадзіньняў фасфарытаў абумоўлівае магчымасьць будаўніцтва суперфасфатнай прамысловасьці. Разьвіваецца тут таксама вытворчасьць будаўнічых матэрыялаў.

Беларусь

У другую пяцігодку разьвіцьцё гаспадаркі Беларусі будзе грунтавацца на базе высакрэтнага разгорту торфу, лесу і інтэнсыўнага разьвіцьця сельскай гаспадаркі. Асноўны напрамак сельскай гаспадаркі Беларусі — гэта прадукцыйная жывёлагадоўля, птушкаводзтва, тэхнічныя культуры, у прыватнасьці лён і бульба. Буйны рост гэтай сыравой базы для лёгкай індустрыі дае магчымасьць запрактыкаваць значнае разьвіцьцё як харчовай, так і апрацоўчай прамысловасьці ў галіне ільну.

Расьце торфаздабыча. Таварыцкі з Беларусі праектуецца торфахімічны завод. Гэта пытаньне павінна быць таксама дэталькова абгаворана. Разьвіваецца выраб электраэнергіі на торфе. З асобных прадпрыемстваў прамысловага будаўніцтва трэба адзначыць будаўніцтва у галіне торфахімі, у галіне папяровай справы, у галіне дэкаратыўнага, лесахэмічнай вытворчасьці, перапачатковай апрацоўкі ільну і далейшай перапрацоўкі ільну (прадзіва, тканіна).

Оказанае мною аб значэньні пярспектыў гаспадарчага разьвіцьця асобных вобласьцей і краёў, сьведчыць аб вялізарным размаху будаўніцтва, якое павінна быць запрактыкавана ў другой пяцігодзе. Мы робім вялізарны крок наперад у справе асваеньня натуральных багацьцяў Саюзу, у справе разьвіцьця прадукцыйных сіл ва ўсіх куткох нашай краіны. Для таго, каб выканаць пастаўленыя задачы, каб ажыцьцявіць практычны выкарыстаньні натуральных рэсурсаў, якія ляжаць на кожную з асобных вобласьцей, трэба разгарнуць выключную работу на разведках і пошуках тых або іншых выкапняў, у асабліва сьці у калгасных і у прамысловых адносінах раёнах. Таму пры распрацоўцы плянаў другой пяцігодкі трэба запрактыкаваць такое разгортваньне геалёгаразьведачных работ і стварыць такую матэрыяльна-тэхнічную базу для іх, якія-бы забясьпечылі выкананьне гэтых задач і падрыхтавалі-б базы выключных натуральных рэсурсы для іх усястаронняга прамысловага выкарыстаньня і разьвіцьця вытворчасьці.

Узровень дабрабыту працоўных

Адной з цэнтральных задач плянаў на якую я ўжо ўказваў, зьяўляецца павышэньне ўзроўню дабрабыту працоўных. Новы пяцігадовы плян павінен быць распрацоўван такім чынам, каб гэта задача атрымала найбольш поўнае і ўсебаковае выяўленьне ва ўсіх праектаваньнях плянаў — як у адносінах узроўню харчаваньня, так і у адносінах спабжэньня прамтаварамі, жыльлёва-камунальнага будаўніцтва, бытавога абслугоўваньня і г. д.

Вы ведаеце ўжо з тэзісаў, што мы лічым неабходным забясьпечыць у другім пяцігодзьдзі такое разгортваньне вытворчасьці лёгкай і харчовай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, якое забясьпечыла-б павялічэньне норм спажываньня ня менш чым у 2-3 разы.

Сваёй пераходам на фабрыку калгасьнікі, беднякі і сераднякі — аднасобнікі ясумоцна, робяць сваюк у сэнсе ацэнкі сваёй сацыяльнага становішча. Але пазнаючы катэгорыі з гэтых калгасьнікаў, некаторыя катэгорыі з гэтых беднякоў і сераднякоў — аднасобнікаў упадаюць у асаблівасьці пралетарыяту дробна-буржуазнага настрої, разьвіцьця тэндэнцыі. Адсюль перакажна мы маем прагулы на прадпрыемствах, ад сюль некамуністычныя адносіны да працы ў асобных прасёлках, у адсюль у паасобных прасёлках, у паасобных групах/ рэакцыя настрої. Гэта — зьяўляецца сваёасаблівай формай май уплыву дробна-буржуазнай стыхіі на тыя ці іншыя праслойкі рабочай клясы?

І ці-ж нам ня прыдзецца весьці самую рашучую барацьбу за сацыялістычную дысцыпліну, за перавыкананьне гэтых новых кадраў, за 6 умоў тав. Сталіна? Ці-ж няма такіх вышадкаў, калі неасобныя групы рабочых ацэньваюць рабочую дзяржаву? У Данбасе некаторыя групы рабочых, ня выконваючы сваёй нормы выпрацоўкі, робяць так. Частка з іх, аднак, напрыклад, іва ацэну долю сваёй выпрацоўкі, і ён выступае ў ролі рабочага, які ня толькі выканаў нормы, але і значна перавыканаў іх. На гэтай аснове зм прымлівае па прэміяльна-прагрэсыўнай сыстэме. Уся група ў выніку атрымлівае больш, чым фактычна выпрацавала. Тут простае ашуканства дзяржавы.

Гэтыя рэакцыя тэндэнцыі, аб якіх гаварыў Ленін, трэба рашуча выганяць з асяродзьдзя рабочых. Ленін, ставячы пытаньне аб арганізацыі спаборніцтва, падкрэсьліваў, што паасобныя групы рабочых адносяцца да народнай фабрыкі, як чужыкі, і прабуюць «сарваць большы кавалак і ўцячы».

Перад намі, значыцца, вострая стаіць задача перавыхаваньня гэтых новых пакаўпленьняў, задача барацьбы з антыдзяржаўнымі, антыпралетарскімі настроямі ў радах паасобных праслоек рабочых, перавяжна з асяродзьдзя пагалоўна прыйшоўшых на сацыялістычную фабрыку.

Што гэта, калі не сваёасаблівыя фор мы клясавай барацьбы? Хто думае, што перавыхаваньне гэтых кадраў, барацьба за новую дысцыпліну пойдзе спакойкам, што «мы ўсё можам», «нам усё ні па чым», той глыбока памыляецца.

Ленін ня раз паказваў, што сёта інтэрнацыі, сёта заўсёды мае вялізарнае значэньне. Барацьба з рэшткамі капіталістычнага мінулага павінна весьціся штодзённа.

Ленін гаварыў, што дыктатура пралетарыяту ёсьць упартая барацьба — крывавая і бескроўная, гвалтоўная і мірная, ваенная і гаспадарчая, педагагічная і адміністрацыйная — супроць сіл і традыцый старога грамадзтва. Ленін падкрэсьліваў, што сіла звычак мільёнаў і дзесяткаў мільёнаў — страшэнная сіла.

Адсюль відаочна, што клясавая барацьба ў другой пяцігодцы будзе працягвацца, але будзе насіць іншыя формы. Менш устойлівыя члены партыі не застрахаваны ад правапартуністычных хістаньняў у барацьбе за перавыкананьне калгасьніка ў працаўніка сацыялістычнага грамадзтва, у барацьбе за ліквідацыю клясаў, за новую дысцыпліну працы.

IV.

Якая будзе расстаноўка клясавых сіл у вёсцы?

У 1932-33 г. мы ў асноўным закончым калектывізацыю і ліквідацыю кулацтва, як новыя формы клясавай барацьбы. Таму, было-б злачынствам сьцьвярджаць, што клясавая барацьба ў другой пяцігодцы спыняцца. Нельга ні на мінуту забываць, што ў другой пяцігодцы тутарна ідзе аб перарозьбы мільёнаў. У другой пяцігодцы мы павінны перарабіць мільёны калгасьнікаў, у другой пяцігодцы мы павінны перарабіць мільёны батракоў і серэднякоў і аднасобнікаў і калгасьнікаў. Гэта прыдуць на нашы прадпрыемствы пасьлядоўна-сацыялістычнага тыпу.

Барацьбу за канчатковую перарабку вопытнай мільёнаў мы не закончым да канца другой пяцігодкі, калі будзе ўжо пабудавана сацыялістычнае грамадзтва. Мы да канца другой пяцігодкі ліквідуем клясы, але людзі — прадстаўнікі былых клясаў — застануцца, і сёта звычаю мільёнаў, дзесяткаў мільёнаў будзе давадзь сабе адчуваць. Нарэшце, нельга забываць і таго, што былыя кулакі і гандляры, былыя чыноўнікі, былыя актыўныя ўдзельнікі барацьбы супроць пралетарыяту хоба-ж гэтыя групы не ня хаваюць яшчэ рэшткаў сваіх старых ідэй, хоба-ж усе яны забудуць аб сваіх старых прывілеях.

Да канца другой пяцігодкі мы пабудуем сацыялістычнае грамадзтва. Але, як вусім правільна адзначаецца ў праграме Камінтэрну, пры сацыялізьме «падзел працы, г. зн. эканомнае поўных працоўных функцый за пэўнымі групамі асоб, яшчэ ня зжыта, і, у прыватнасьці, яшчэ ня зьнішчана ў асноўным процілеглясьць паміж разумовай і фізічнай працай. У вазьмасьці ёсьць яшчэ, на гледзячы на зьнішчэньне клясаў, рэшткі старога клясавага падзелу грамадзтва, а, значыцца, і рэшткі дзяржаўнай улады пралетарыяту, прымус. права... Ня зьнішчана і ня зжыта цалкам процілеглясьць паміж горадам і вёскай».

Адсюль вынікае, што ў другой пяцігодцы і да канца другой пяцігодкі клясавая барацьба ў яе сваёасаблівых, мадыфікаваных формах ня сумненна будзе працягвацца. Гэта не павінна затушаваць таго асноўнага факту, што клясы ў нашай краіне будуць канчаткова ліквідаваны, і Савецкі саюз ператворыцца ў напрыступную крэпасьць міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі.

V.

Мы ў другой пяцігодцы зробім скачок у сэнсе ўзьняцьця матар'яльна-бытавога ўзроўню ўсіх працоўных. Да канца другой пяцігодкі мы ставім задачу — павялічыць у тры разы колькасьць прадметаў спажываньня. Але разьмеркаваньне будзе адбывацца ня па патрэбнасьцях, а па колькасьці і якасьці працы. Да таго часу, пакуль наступіць «вышэйшая» фэза камунізму, сацыялісты патрабуюць — самага суровага кантролю з боку грамадзтва і з боку дзяржавы над мерай працы і мерай спажываньня...» (Ленін). Маркс і Ленін вучылі нас, што толькі ў поўным камуністычным грамадзтве кожны зможа атрымаць па патрэбнасьцях, а давадзь па здольнасьцях. Неабходнасьць кантролю за мерай працы і спажываньня выцякае з узроўню працоўных сіл грамадзтва. Нельга забываць, што «...спосаб разьмеркаваньня істотным чынам залежыць ад колькасьці рэчаў, якія падлягаюць разьмеркаваньню, і што гэта колькасьць, зразумела, мяняецца разам з прагрэсам вытворчасьці і грамадзкай арганізацыі, а значыцца, і спосаб разьмеркаваньня можа зьмяняцца» (Энгельс). Спосаб разьмеркаваньня ў канчатковым выніку—выцякае ад спосабу вытворчасьці.

А дробнабуржуазныя элемэнты, якія прыйшлі на фабрыку, рабочыя нізкай кваліфікацыі, калгасьнікі нізкай кваліфікацыі — хоба-ж некаторыя з іх ня будуць зьяўляцца носьбітамі ўраўніцельных ідэй, ураўніцельных тэндэнцый? Значыцца, нам, прыдзецца працягваць бальшавіцкую барацьбу супроць дробнабуржуазнай, «левацкай» ураўнялёўкі. Барацьба павінна быць рашучай і ў другой пяцігодцы і да канца другой пяцігодкі, бо пры сацыялізьме, калі мы закончым другую пяцігодку, разьмеркаваньне на колькасьці і якасьці затрачанай працы будзе працягвацца. Гэты спосаб разь

Японскі праект падзелу кітайскіх портаў

УСУН І ЧАПЭЙ ТРЫМАЮЦЦА СТОЙКА

Амэрыканскія і ангельскія дрэдэжнікі гатовы дапамагаць Японіі

Плян падзелу Кітаю

ТОКІЁ, 9. Паводле заявы агенцтва Сімбун Рэнга, на пасяджэньні рады міністраў Іосізава заявіў, што **плян стварэньня нэйтральных зон вакол 5 буйнейшых кітайскіх портаў распрацаван у выглядзе «пробнага шара»** ваеннымі і дыпляматычнымі коламі Японіі ў Шанхаі. Міністэрства замежных спраў афіцыяльна яшчэ ня вызначыла сваіх адносін да гэтага праекту. Як вядома, гэтымі днямі міністэрства замежных спраў афіцыяльна запрапанавала японскім дыпляматам за мяжой высьветліць адносіны дзяржаў да гэтага праекту. Пакуль што паступілі паведамленьні толькі ад ПАЗШ. **Там гэты праект адхіляецца.** (ТАСС).

Амэрыканскі друк аб дэкляраці японскага ўраду

НЬЮ-ЁРК, 8. Вашынгтонскі карэспандэнт «Нью-Ёрк Таймс» паведамляе, што дэкларацыя японскага ўраду ад 7 студзеня выклікала значнае заклапочанньне амэрыканскіх урадавых колаў, якія вітаюць «прымірэнчую пазыцыю Японіі і яе жаданьне супрацоўнічаць з іншымі дзяржавамі».

Што-ж датычыць той часткі дэкларацыі, у якой Японія заяўляе аб сваім ранейшым адмаўленьні ў Шанхаі ваенныя памацаваньні з мэтай «абароны жыцьця і маемасьці японскіх грамадзян», дык паводле паведамленьня «Нью-Ёрк Таймс» у афіцыяльных колах заяўляюць, што тыя-ж заданьні **даны і амэрыканскім вайскам.** (ТАСС).

Супрацоўніцтва імпэрыялістаў у Шанхаі

НЬЮ-ЁРК, 9. Як паведамляюць з Шанхаю, амэрыканскае і ангельскае войска прыгатавалася да таго, каб дапамагчы японскім нападам супроць кітайскай пяхоты, якая наступае на міжнародны сэтльмэнт. Замежнае войска зьнішчыць кожнага кітайца, які адважыцца напасьці на якую-небудзь частку сэтльмэнту, — так заявіў камандуючы замежнымі войскамі ангельскі генэрал Фламінг. Паводле тыхжа вестак, кітайскае войска працягвае ўтрымліваць «Усунскія форты, супраціўляючыся атакам японцаў з сушы і з мора.

Напярэдадні баёў у Нанкіне

НЬЮ-ЁРК, 9. Згодна дэпэшэньню амэрыканскага консула ў Нанкіне чакаецца пашырэньне ваенных дзеяньняў. Консул папярэдзіў амэрыканскіх грамадзян аб неабходнасьці эвакуявацца са Нанкіну.

Амэрыканскія войскі застаюцца у Шанхаі на стала

НЬЮ-ЁРК, 9. Як паведамляе газэта «Гэральд Трыбюн», амэрыканскі консул у Шанхаі заявіў, што амэрыканскія грамадзяне застаюцца ў Шанхаі «на нявызначаны час». Тая-ж газэта піша, што амэрыканскія войскі ўстаўляюць кантроль над пагранічнай часткай міжнароднага сэтльмэнту, куды чакаецца напыў кітайскіх салдат у выпадку захвату японскімі войскамі Паўночнага вакзалу. Амэрыканская ўлада рыхтуе спэцыяльны плякат на кітайскай мове, у якім гаворыцца: «Салдаты, вам дазваляецца вайсьці ў сэтльмэнт, калі вы здасьце зброю». Плякат будзе вывешан на відным месцы.

«Асошыэйтэд Прэс» паведамляе, што амэрыканская пяхота рыхтуецца да доўгага прабываньня ў Шанхаі, «магчыма нават, што і да пастаяннага».

Японія — за далейшае вядзеньне вайны

ШАНХАЙ, 9. Як падае газэта «Чайна Прэс», прапанова ангельскага адмірала Кілі спыніць ваенныя дзеяньні прынята кітайскімі ўладамі і ў прыватнасьці адхілена Сігеміцу (японскі паслаўнік у Кітаі). Як перадаюць, Сігеміцу заявіў, што **Японія на можа абмяркоўваць пытаньня аб спыненьні ваенных дзеяньняў** да таго часу, пакуль кітайскае войска ня будзе адкінута на адлегласьць у 15-20 міль ад сэтльмэнту. (ТАСС).

Японскія заказы ў Польшчы

ВАРШАВА, 4. У Варшаўскіх палітычных і эканамічных колах цыркулююць чуткі аб тым, што металюргічная прамысловасьць Верхняй Сілезіі ў сувязі з ваенным канфліктам на Далёкім Усходзе атрымала заказы ад Японіі **ў 3 млн. руб.**

Супраціўленьне, роўнага якому ня ведае кітайская гісторыя

ШАНХАЙ, 9. Бутхэд (вядомы ангельскі журналіст) піша, што японскае ваеннае камандаваньне запусьціла ў Шанхаі ўсе памылкі, якія магчы-бы мець месца пры даных умовах.

Першая памылка — ваенныя акцыі былі распачаты без выстарчальных для захопу Чапею сіл. Разбуреньне Чапею артылерыйскай і паветранай бамбардыроўкай і напасьцьне вялізарных страт грамадзянскаму насельніцтву зьяўляюцца вялізарнай палітычнай памылкай, бо ўсё насельніцтва падтрымлівае цяпер кітайскую армію, якая аказвае супраціўленьне, якое **ня мае сабе роўнага ва ўсёй кітайскай гісторыі.** У рэзультаце ўсяго палітыкі, якія раней хісталіся ў пытаньні аб аказаньні супраціўленьня Японіі, цяпер перасталі хістацца.

Тое, — піша далей Бутхэд, — што магло аказацца лёгкай задачай для японскай дывізіі ўсяго толькі тыдзень назад, цяпер патрабуе вялізарных ваенных намаганьняў. Горшая ваенная памылка — бамбардыроўка Усуну флётам без выстарчальных сухаземных войск, каб замацаваць посьпех бамбардыроўкі. (ТАСС).

Ангельскі капітал у Кітаі

ЛЕНДАН, 3. **Брытанскія капіталаўкладаньні ў Кітаі складаюць 260 млн. фунтаў стэрлінгаў,** з якіх 100 млн. укладзена ў нярухомасьць, 41 млн. — кітайскія ўрадавыя пазыкі, 24 млн. — чыгуначныя канцэсіі, 9 млн. — існуючыя ў Кітаі 4 ангельскіх банкі, 3 млн. — здабываючую прамысловасьць і г. д.

Пад брытанскім кантролем знаходзяцца 35 проц. чыгунак, 16 проц. усяго кітайскага вугалю здабываецца ў капальнях, якія належаць англічанам, у Хубэі і Хэнаі — да 3 млн. тон у год. Трэцяя частка кітайскага параходзтва знаходзіцца ў брытанскіх руках. 75 проц. усяго рэчнага і прыбярэжнага паравога флёту таксама належыць брытанскім прадпрыемствам. Брытанскі капітал у Шанхаі ацэньваецца ў 63 млн. фунтаў стэрлінгаў. Важнейшая прамысловасьць Шанхаю — тэкстыльная — абсталявана галоўным чынам, ангельскімі машынамі. (ТАСС).

Усесаюзная камсамольская нарадзе па аўладаньні агратэхнікай

(Ліст Народнага камісара зямляробства Саюзу ССР тав. Якаўлева)

Дарогія таварышы! У мінулым годзе саўгасы і калгасы справядліва гапарыліся тым, што на працягу аднаго году яны далі такое папярэдняе пасеўных плошчаў, на якое патрабавалася ў царскай Расіі дзесяцігодзьдзе. Гэтыя саўгасы і калгасы даказалі, што яны лепш кулакоў і паменчыкаў умеюць асвойваць новыя прасторы пад зямляробства ў нашай краіне. Цяпер, аднак, гэтага ўжо мала. Цяпер, у 1932 годзе, трэба паказаць і даказаць, што і калгасы і саўгасы могуць з плошчаў, якія папярэдняе, зьбіраць лепшы ўраджай. Барацьба за ўраджай — гэта галоўная задача. Барацьба за ўраджай — важнейшае зьвяно ў справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Барацьба за ўраджай — значыць:

1) пакончыць з агідным, часта дзяцінскім бязгаспадарчым скарыстаньнем зямлі. Прыступіць тэрмінова да ўкараненьня адпаведных севазваротаў.

2) Скараціць тэрміны сяўбы. Кожны лішні дзень спазьненьня сяўбы зьмяншае ўраджай і забірае ў калгаснікаў і ў дзяржавы шмат пудоў збожжа з гектара. Кожны лішні дзень затрыманьня пасеву яравых ставіць у засушлівых раёнах яравыя пад удар засухі.

3) Скончыць з неахайнасьцю, пасьпяховасьцю, дрэннай якасьцю апрацоўкі зямлі. Ворыва з агрэхамі, пасевы нярэгулярныя з прапускамі — ганьба для калгасаў і саўгасаў.

4) Скончыць з агіднай лоскай машын на нашых палёх. Справа ня ў тым, каб 30 гадзін узасаб гарачна працаваць на машыне, а пасьля машыну кінуць на злом. Справа ў тым, каб кожная машына працавала палкам і ў поўным парадку вызначаную ёй колькасьць гадзін на працягу ўсяго сельска-гаспадарчага сэзону. Справа ня ў тым, каб узяць з трактара ў адзін сэзон рэкордную колькасьць гектараў і пасьля кінуць яго ў-за непрыгодасьці, а справа ў тым, каб працаваць на трактары без усякіх перабояў і ўвосень абыйсьціся без капітальнага рамонту.

5) Найбольш магутная зброя ў барацьбе за ўраджай — МТС. Цэнтральная фігура МТС зьяўляецца трактарыст. Створым пастаянныя кадры трактарыстаў, навучым гэтыя кадры, ператворым іх у майстраў зямлі.

6) У гэтым годзе на мільёнах гэктараў сарэвнаваў дабіліся культурных расьлін. Сарныя ўжо ва ўсякім выпадку не ад «бога», не ад клімату, а ад нашых уласных агідных адносін да справы. Зьнішчым сарнякі дакладнай апрацоўкай міжрадзьдзяў, апрацоўкай папару, вылучэньнем засьмечаных земляў пад чысты папар.

7) Абязьлічка — зьлейшы вораг саўгасаў і калгасаў. Выканаем пастановы ЦК УсеКП(б) аб брыгадах і брыгадзірах у калгасах — тым самым гаспадарча рэгулюем і ўмацуем калгасы, выканаем 6 умоў тав. Сталіна. Памятайце, што брыгада павінна стаць важнейшым зьвяном у арганізацыі працы сельска-гаспадарчай арцелі, што зьяўляецца на даным стадыі пануючай формай калгасу. Камсамольцы, вашы магчымасьці ў галіне прыстасаваньня новай тэхнікі — вялізарныя. Іменна вы, на працягу аднаго году, у адказ на прапанову Наркамзему СССР сіламі камсамольцаў выкапаць і зашэпчыць сіласам мільёны ям — сваёй работай жыпамаглі калгасам і саўгасам залажыць ½ млрд. пудоў сілосу. Цяпер вы павінны стаць у рады лепшых калгаснікаў, саўгасных рабочых у барацьбе за аўладаньне тэхнікай сельскай гаспадаркі, за прыстасаваньне на нашых саўгасных і калгасных палёх лепшых заваяваньняў агранаміі. Лёзунг аўладаць тэхнікай для вас азначае на толькі аўладаць тэхнікай у сельскай гаспадарцы, але і аўладаць агранамій. Ад кніжкі і вопытнай стуцыі — да брыгады пасеўвайце правілы навуковага вядзеньня гаспадаркі.

За высокі ўраджай! За сапраўдную пасеўную работу камсамольцаў у справе барацьбы за ўраджайнасьць!

Народны камісар зямляробства Саюзу ССР Я. ЯКАЎЛЕЎ.

Абавязковая пастанова

Менскага гарадзкога савету рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў

26 сьнежня 1931 г. № 39-782, г. Менск

Аб ачыстцы вуліц, тратуараў і дахаў ад сьнегу

Менскі гарадзкі савет рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў

ПАСТАНАВУЛЯЕ:

1. Абавязаць усе домаўладаньні, якія належаць камгасу, жыльтаварыствам, жаўрэўным установам і грамадзкім арганізацыям, а таксама арэндатарам і прыватным уласьнікам будынкаў і незабудаваных зямельных участкаў г. Менску рабіць штодзённа раніцай да 8 гадзін ачыстку ад сьнегу і лёду тратуараў, вуліцы і рынштокаў.

2. Да паказанага ў пункце 1 гэтай абавязковай пастановы часу, домаўладаньні павінны ачышчаць тратуары ад сьнегу і лёду і пасыпаць іх пяскам, прарубіць рынштокі, а ўвесь рыхлы сьнег, які знаходзіцца на вуліцах і плошчах, згарнуць у кучы і неадкладна вывозіць у адведзеныя месцы, пазначаныя ў § 4.

УВАГА: Сьнег і лёд з вуліц і тратуараў павінен ачышчацца тады, калі пры ачыстцы яго не пашкодзіцца тратуар або брук, для чаго неабходна рыхлы сьнег адсоўваць у кучы драўлянымі лапатамі, а больш шчоры скробці жалезнымі скрабніцамі, не прабіваючы да брукту пакрыцьця асфальтавага, клінкернага або брушчатага.

3. У выпадку паданьня сьнегу на працягу ўсяго дня, ачыстка тратуараў і пазбаўленьне рыхлага сьнегу з вуліц і плошчаў павінна рабіцца па меншай мерэ у дзень з такім разьлікам, каб гэта не перашкаджала вулічнаму руху.

4. Сабраныя кучы і валы сьнегу, або лёду павінны быць на працягу сутак вывезены ў адведзеныя месцы звалак:

а) каля калгасу «Адраджэньне» (раён Кальварыя),
б) » » імя Дзяржынскага (Малая Сыліцкая),
в) » » імя ЦВК (Лошыца Немаршанскага),
г) » арцелі «Агародніх» (Тры карчмы),
д) » » «Свабода» (Пяроспа),
е) » » «Чырвоная зорка» (в. Стаповая).

5. Домаўладаньні павінны наглядаць за ачысткай ад сьнегу і лёду крыш пажарных калодзяў гарадзкога водапроводу, якія знаходзяцца на прылягаючых да іх уляданьнях вуліцах.

6. З надыходам тэмпэратуры вышэйшага таяньня сьнегу, лёд на забруджаных вуліцах павінен скалвацца і вывозіцца парадкам, пазначаным у п. 4 гэтай абавязковай пастановы.

7. Сьнег і лёд, які знаходзіцца на дахах павінен быць з іх скінут з надыходам вясны, а ў выпадках, калі сьнег і лёд пагражае абвалам, то і ў сямовы час, прычым у часе скіданьня сьнегу і лёду з даху павінны быць прыняты наступныя меры папярэджаньня:

а) тратуары і вуліцы перад домамі павінны быць загароджаны;

б) скіданьне павінна рабіцца з такім разьлікам, каб папярэдзіць пашкоджаньне тэлеграфных і тэлефонных праводоў, а таксама і вулічных ліхтароў.

УВАГА: У выпадку пашкоджаньня ліхтароў, або праводоў, домаўладаньніцтва вынаўчае адведзеныя установам кошт рамонту.

8. Ачыстка даху робіцца раніцай і павінна быць закончана да 10 гадзін, а скінуты сьнег і лёд вывозіцца у парадку, пазначаным у п. 4 гэтай пастановы.

9. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на міліцыю.

10. Вінаватыя ў невыкананьні гэтай абавязковай пастановы падлягаюць адказнасьці ў адміністрацыйным парадку, штрафу да 100 руб., або прымусовым работам на 14 дзён.

11. Гэта абавязковая пастанова набывае моц са дня апублікаваньня.

Старшыня Мэнгарсавету ВАЛОДЗЬКА
Сакратар ШАЛКАВЕЦ.

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б „ЗЬВЯЗДА"

Працягваецца прыём падпіскі на 1932 год

НА ЧАСОПІС ПАЛІТЫКІ І ПРАКТЫКІ ПАРТЫЙНАЙ ПРАЦЫ

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"

ОРГАН ЦК КП(б)Б.

Кожнаму партыйцу, актывісту, прапагандысту неабходна чытаць „БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ".

Часопіс „БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ" ў 1932 годзе выходзіць два разы ў месяц (24 №№ у год).

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:
на 1 м.— — 40 к. на 6 м.—2 р. 40 к.
на 3 м.—1 р. 20 к. на 12 м.—4 р. 80 к.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: на пошце, лістаносцамі і ў паўнаважаньнях на месцах ва ўсіх прадпрыемствах і ўстановах БССР.

Французскія мільярды — на ўзбраеньне васалаў

ПАРЫЖ, 4. Марсэль Кашэн апублікаваў у «Юманіце» даныя аб пазыках, якія прадстаўлены французкім урадам розным дзяржавам з 1919 г. па 1931 г. Па гэтых даных, якія тав. Кашэн лічыць перабольшанымі, агульная сума ўсіх пазык перавышае 15 млрд. франкаў, з іх 2 млрд. былі прадстаўлены Польшчы і 2 млрд. Румыніі. У прыватнасьці ў 1931 г. Францыя прадставіла Румыніі пазыку ў 575 млн. франкаў, Юга-Славіі — 925 млн. франкаў, Вэнгрыі — 354 млн. франкаў і Англіі — 2 млрд. 500 млн. франкаў.

АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ

РАМАНС НА КОНКУРС

1932. Польшча. Жахлівы крызіс. Сотні тысяч беспрацоўных. Голад. Як сродак выйсьця з гэтага становішча ўслужлівыя газэты абвяшчалі конкурс на раманс, які будзе выконвацца ва ўсіх рэстаранах з мэтай напомніць публіцы пра беспрацоўных, і абудзіць пачуцьцё дапамогі.

Лічу патрэбным адгукнуцца на «дабрачынны конкурс» віленскіх газэт — пасылаю напісаны мною раманс.

Забаўляйцеся, ўскрыляйце весялосьць,
Бакалы падымайце, як штандары...
Мяцеліцаю сьмерці і пажараў
Галодную айчызну замяло.
Гуляй, душа! Айчызна, кліч жандараў
Скрышыць учэнт нямодный чэрні косьцы!..
Эх, забаўляйцеся, ўскрыляйце весялосьць,
Бакалы падымайце, як штандары...

Ўзьлятай, факстрот! Шугай мільёнам зор!
Зь дзяцінае кроў віном пераліваецца!
Барыкадамі сыны пругонай працы
Бальшавіцкае адточваюць лязо.
І хлебам роспачы ад штурму ўратаваецца
Айчызна ўславіла разьюшаны гэрой!..
Ўзьлятай, факстрот! Шугай мільёнам зор!
Прымусім кроў віном пераліваецца!

Ах, вочы чорныя! Сузорная імгла
Ты раніш сэрца непакорнай львіцай.
А па вуліцах бунтуе навальніца:
Краты ўзломаны, ў крыві асколкі шкла.
Няўжо айчызна змушана скарыцца?
Дзе часьць сталеньцяў белага арла?..
Ах, вочы чорныя! Сузорная імгла
Ты раніш сэрца непакорнай львіцай.

Правесьню шчасьця песьнямі гукай,
Но шчасьце сонечнай атуліць пазалотай.
Галасы мільёнаў: «хлеба і работы»,
Пастаяннымі прахоладзь з краю ў край.
О, беспрацоўе дзікае. Паны, падайце злоты,
Хай будзе шчодраю шляхецкая рука.
Правесьню шчасьця песьнямі гукай,
Но шчасьце сонечнай атуліць пазалотай.

Са скал жыцьця ўзьлятай на крыльлі хмар,
Ратуйся ў высь, як сокал лётаць здолей!
Крывёй запырскана айчызна, як ніколі —
Самагубствы, голад, пошасьць і турма.
А з-пад зямлі, з глыбокага падполля
Агвёй гудзіць падрыхтаваны ўдар!..
Са скал жыцьця ўзьлятай на крыльлі хмар,
Ратуйся ў высь, як сокал лётаць здолей!

За вялест радасьці, за прозаладзь пяцігод —
Апошні тост, аркестры, дуй мазурку!

Жывым, за валам кай, шматмільённым гуртам
Зарэе час вітаць пераварот!
Вызваленьня грозны, але шчасьлівы год!
І запыяцца ў выбуху-турэмныя падкурні

Менск, 5/II — 32.

Захват Літвы — на парадку дня польскага фашызму

ВАРШАВА. У сувязі з падзеямі ў Мэмэлі і рэжкім пагоршаньнем літоўска-германскіх адносін у польскіх палітычных колах ажыўлена абмяркоўваецца пытаньне аб уцягненьні Літвы ў «сфэру ўплыву Польшчы».

З гэтага пункту гледжаньня надзвычай характэрна прамова, што сказана была ўчора ў сойме былым міністрам Станевічам, які заклікаў польскі ўрад дабівацца згоды з Літвой. «Вільня ня мае зараз рынкаў збыту, — заявіў Станевіч, — і перастала быць цэнтрам скрыжаваньня чыгуначных шляхоў, з прычыны наяўнасьці «мёртвых» граніц. Вільня ўсё больш бяднее.

Я глыбока веру, што братэрскі літоўскі народ зразумее, што час, калі ён адважыўся - б са зброяй у руках выступіць у мэтах захвату Вільні, быў-бы таксама апошнім часам літоўскай незалежнасьці. Моцная Польшча гарантуе незалежнасьць Латвы і Прыбальтыцкіх дзяржаў. Калі-б літоўцы гэта зразумелі, дык варотаў Вільні былі-б адчынены для іх, а горад адкаўў-бы сваё ранейшае становішча на гістарычных гандлёвых шляхох».

Адначасова з яўнай мэтай узьдзеяньня на Літву ўчора палёнафільскія колы віленскіх літоўцаў арганізавалі ўрачысты вечар, нібы з прычыны ўшанаваньня рымскага папы. Асноўным зьместам вечара зьявіліся антылітоўскія прамовы, якія кляймілі рэжым літоўскага ўраду і праследаваньні духавенства ў Літве. Нарэшце, не пазбаўлен значэньня ў сувязі з гэтым той факт, што ўчора ПІЛСУДЗКІ ПРЫНЯЎ АРГАНІЗАТАРА ПАХОДУ НА ВІЛЬНЮ — ГЕНЭРАЛА ЖЭЛІГОЎСКАГА І МЕЎ З ІМ ДОЎГУЮ ГУТАРКУ. (ТАСС).

Дэманструюць сваю салідарнасьць з Савецкім Кітаем

СТАКГОЛЬМ, 9. Кампартыя і камсамол заклікаюць шведскіх рабочых абвясьціць бязьлітасную барацьбу супроць імкрыялістычнай вайны і дэманстраваць сваю салідарнасьць з Савецкім Саюзам, а таксама з Савецкім Кітаем. Ва многіх гарадох былі арганізаваны антываенныя мітынгі.

ПЯЦІГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ БДТ—2

15-га лютага спаўняецца пяцігодзьдзе другога Беларускага Дзяржаўнага Тэатру. Пройдзены шлях БДТ-2 быў шлях упартай барацьбы за дзейны пралетарскі паказ, шлях актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве.

У дзень юбілею ў Гомелі, дзе зараз працуе тэатр, адбудзецца шырокае ўрачыстае пасяджэньне гарсавету.

На ўсіх буйных прадпрыемствах гораду разгорнуўся да юбілею тэатру шырокая падрыхтоўка.

Калектыў актораў БДТ-2 рыхтуе тэатралізаваны з усіх сваіх лепшых пастановак.

На сьвяткаваньне юбілею з Менску выязджае вялікая дэлегацыя ад партыйных, прафэсіянальных і пісьменніцкіх арганізацый і ад дзяржаўных тэатраў БССР.

ПАПРАЎКА

Ва ўчарашнім нумары «Зьвязды» ў нотатцы з Бабруйску «Мяцецца рады ўдарнікаў», пры перадачы па тэлефону ўкраліся наступныя памылкі:

Надрэчанская: Любанькі і Кунелічы сельсаветы, трэба чытаць «Любоніцкі і Кацуліцкі»; замест: Мохавічы і Фальшаў слабады» трэба чытаць «Мохавічы і Папава Слабада».

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Аб прапрацоўцы пастаноў XVII канфэрэнцыі УсеКП(б) і XIV зьезду КП(б)Б

Пастанова сакратарыяту гарадзкога камітэту КП(б)Б ад 8 лютага 1932 году

1. Пастановы XVII партыйнай канфэрэнцыі УсеКП(б) і XIV зьезду КП(б)Б маюць вялізарнае палітычнае значэньне для партыі і шырокіх рабочых, калгасных і працоўных мас. Пастановы канфэрэнцыі і зьезду павінны быць шырока прапрацаваны як серод партыйнасьці, так і серод шырокіх рабочых, калгасных і працоўных мас.

Гарком КП(б)Б прапануе правесьці наступныя мэрапрыемствы:

1. на працягу часу з 10 па 20 лютага 1932 году правесьці агульна-партыйныя і камсамольскія сходы ячэек з прыдзяньнем шырокіх рабочых і калгасных мас для прапрацоўкі пастаноў XVII усесаюзнай канфэрэнцыі УсеКП(б) і XIV зьезду КП(б)Б. Культпропу гаркому забясьпечыць дакладчыкамі.

2. Лічыць неабходным пастановы XVII канфэрэнцыі УсеКП(б) і XIV зьезду КП(б)Б прапрацаваць на агульных сходах рабочых, калгаснікаў, з прыдзяньнем адпасобнікаў, высьвятляючы гістарычнае значэньне пастановаў XVII партканфэрэнцыі, скарыстаўшы абведзеныя пералікі для масавай работы вакол пастановаў XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б.

Партбюро і ячэйкам выдзеліць адпрыцаваных работнікаў ячэек і партактывістаў для правядзеньня шырокай растлумачальнай работы ў цэхах, брыгадах, атрэдах і г. д.

3. Ва ўсёй сэтцы партасьветы (школы, гурткі, курсы) прапрацаваць пастановы XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на якасьць гэтай прапрацоўкі.

Дому Камасьветы сваячасова распрацаваць метадычныя ўказаньні для ўсёй сэтці партасьветы.

4. Лічыць неабходным пастановы XVII канфэрэнцыі УсеКП(б) і XIV зьезду КП(б)Б прапрацаваць у сэтцы камсамольскай асьветы. Гаркому камсамолу забясьпечыць якасьць гэтай прапрацоўкі.

5. Лічыць неабходным прапрацаваць пастановы канфэрэнцыі і зьезду ў школах сацыяльнага выхаваньня грамадзянаўства.

6. Прапанаваць Культпропу склікаць нараду рэдактароў шматтыражак касьцьбіцкіх і штодзённак па пытаньні выкладу XVII канфэрэнцыі УсеКП(б) і XIV зьезду КП(б)Б і аб задачах кажнаго друку.

Паведамленьні

— Дом Камасьветы. 11-II, у 7 гадз. веч., пакой № 6—сэмінары для вайсковых прапагандыстаў па дакладзе тав. Аладжанійскага. 12-II, у 8 гадз. веч.—даклад т. Валосевіча: «Кантрольныя лічбы на 1932 г. па СССР і БССР». Білеты для парт. і камсам. актыву ў ГК КП(б)Б і чытальні Дому.

— Дом Пісьменьнікаў. 11-II, у 7 гадз. веч.—чытворчая нарада літаратуразнаўцаў—рабочых ударнікаў. Чытаюцца новыя творы ўдарнікаў. Яўка актыву рабочых літаратурнай і літаруючай групкоў абавязкова. Запрашаюцца пісьменьнікі.

— Вячэрні Камуніверсітэт Беларускі імя Леніна паведамляе ўсіх таварышоў, што ўсе дадзеныя ў ВКУ, што яны навучаны зьяўляцца на працягу 12—15-II-32 г. у памяшк. Камвузу ад 6—8 гадз. (Университэцкая, 27).

Сёньня, 11 лютага, у г. Менску, у Доме Камасьветы, у 6 гадз. веч. адкры ваецца 1-Я УСЕБЕЛАРУСКАЯ ПАРТЫЙНА-КАМСАМОЛЬСКАЯ НАРАДА ПА ФІЗКУЛЬТУРЫ, скліканая агітмасавым аддзелам ЦК КП(б)Б.

11-га, 12-га і 13-га лютага 1932 году
ў 11 гадзін раніцы ў залі пасяджэньняў ЦК КП(б)Б адбудзецца

ПАШЫРАНАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ

па кіраўніцтве абвешчаным „Правдой" конкурсам нізавых газэт калгасаў, саўгасаў і МТС на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

На парадку дня:

Даклады рэдактароў 17-ці несьцьвенных газэт калгасаў, саўгасаў і МТС і судаклады брыгад цэнтральнай конкурснай камісіі, якія ў гэтых газэтах працавалі.

Выкліканыя (спэцыяльнымі паведамленьнямі) для дакладаў і ўдзелу ў пасяджэньні рэдактары газэт, брыгадзіры, сакратары ячэек, старшыні калгасаў, сельсаветаў і рабкомаў саўгасаў і г. д. паінны зьявіцца толькі на вызначаны для іх дзень.

Яўка для ўсіх членаў цэнтральнай конкурснай камісіі без спазьненьня абавязкова.

Запрашаюцца рэдактары ўсіх цэнтральных газэт.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ КОНКУРСНАЯ КАМІСІЯ.

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

ПРЭМ'ЕРА! ПРЭМ'ЕРА!

ВЯЛІКАЯ ГУКАВАЯ ПРАГРАМА.

„Томмі" — шутлівае прозьвішча ангельскіх салдат.

„ТОММІ"

У ГАЛ. РОЛЯХ:
Томмі—арт. ЖУТАЕЎ,
Кітаец—арт. Н. НЕДРАЎ.
ПАРТЫЗАНЫ:
Старшы—НАЎРЫГІН.
Азорной—ЧУВЕЛЕЎ.
Суслівы — БАНІН.
Пацярпеўшы—ТЭМЕРЫН.
Аратар—БАГАЛЮБАЎ.

Гун зьнят па сыст. „Тагефон".
Сымф. аркестр Межрабпом-фільм.

Ад 11 лютага новы пастаўкі ГУКАВЫ фільм выт. Межрабпом-фільм.
Сэмінары і пастаноўка Я. А. Пратазанава.
Паводле тэмы Ус. Іванова.
Аператар Н. Кузьняцоў.
Гукаазвр С. Вахнісірэй.
Кампазытар А. Шэнгыны.

ШТОДЗЕННА 5 сэансаў:
Каса ад 1 г. дня
Пачатак сэансаў:
Дадатковы— 4-30
I 6 —
II 7-30
III 9—
IV 10-30

Дзеці ў кіно не дапускаюцца.
Пасьля III званка ўваход у залю закрыт.

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Пач. у 2 г. дня. Немецкі нястамі фільм Другое жыцьцё

„ПРАЛЕТАРЫ" Замежны фільм БЯЗРАДАСНАЯ ВУЛІЦА Трагедыя ў 8 частках.

„СПАРТАК" Пачатак сэансаў: 7 г., 9 г. і 11 г. Апошняя, 2-я серыя НІБЭЛУНГІ (Помста Крымгільды) у 10 ч. Каса—з 4 г. дня.

Паведамляецца, што 15-га лютага г. г., у 10 гадзін раніцы у ЗАЛІ ПАСЯДЖЭНЬНЯЎ СНК

адбудзецца

ЧАРГОВАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ

Усебеларускага Штабу садзейнасьці лесазагатоўкам, вывазцы дроў, торфу і лесаатар'яку пры СНК БССР

з наступным парадкам дня:

1. Дыклады старшыні рабочых штабаў садзейнасьці пры РВК: Чачарскага, Ельскага і Шклоўскага, аб ходзе выкананьня плану лесазагатовак, вывазкі дроў, торфу і лесаатар'яку ва пароблений у гэтым напрамку рабоце паказаных райштабаў.

Яўка членаў Усебеларускага Штабу і старшыні паказаных райштабаў абавязкова.

Старшыня Усебеларускага Штабу садзейнасьці лесазагатовак, вывазкі дроў, торфу і лесаатар'яку пры СНК БССР БАСКІН.

Беларускаму Трусту „Сьвінавод" ПАТРЭБЕН інжынер-тэхнік па будаўніцтву. Плата па згодзе. Забясьпечваецца кватэрай. Бальшынаводтрэст.

МЕНГАРСАВЕТ АСОАВІЯХІМУ

12 лютага, у 6 гадзін веч., у памяшк. Дому Чырвонай армії склікае

ПАШЫРАНЫ СХОД

сакратароў ячэек АСО разам з актывам Асоавіяхіму г. Менску.

ПАРАДАК ДНЯ: перавыбары нізавых кіруючых органаў АСО.

Пасьля сходу—нястамная частка.

Гарсавет Асоавіяхіму пад адказнасьць сакратароў ячэек АСО прапануе забясьпечыць поўную яўку актыву на сход.

11 лютага, у 8 г. веч., у чырвонай пікіцы адбудзецца СХОД ад. сэкцыі таварыства вайўнічых матэрыялістаў-дыялектыкаў.

Запрашаюцца дактары гор. Менску.

Сход дактароў-камун кіраў у 7 гадзін веч.

Завтра, 12 лютага, адбудзецца чарговае пасяджэньне савету інстытуту ахматмладу (Савецкая, 16).

Парадак дня:

План працы інстытуту і будаўніцтва.

Запрашаюцца представы ніі НКЗЗ, Гарадзраду, ЦК саюзу МСП, дзярж. і гар. страх кас, сав. быт. сэктару Гарсавету і Камгасу, рабочых работніцы фабрык: „Кастрычнік", „Камунар", „Бальшавік", „Камунарка", „Беларусь", шкотачная, абутковая і інш., а таксама ўсе працаўнікі ахматмладу.

Менск, друкарня «Зьвязды».